УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.82
А 43
ISBN: 978-985-21-0765-5



***Савіцкі А. А., Курэйчык А. В.***

# НАРОДНЫЯ ЛЕКАРЫ ЯК ПЕРШАПАЧЫНАЛЬНІКІ ФАРМАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Магчымасць развіцця любой галіны навукі забяспечваецца шырокім аб’ёмам інфармацыі і жыццёвых ведаў, сабраных папярэднімі пакаленнямі.

Народныя веды беларусаў — гэта сукупнасць усіх ведаў, назапашаных нашымі продкамі ў розных сферах: метэаралогіі, астралогіі, геаграфіі, матэматыцы, медыцыне і многіх іншых.

Безумоўна, навуковая медыцына з’яўляецца ледзь не самай важнай сферай жыцця як беларусаў, так і іншых народаў свету, і бярэ з вопыту народнай медыцыны ўсё самае каштоўнае і найбольш рацыянальнае. Народная медыцына, у сваю чаргу, уяўляе сабой сукупнасць эмпірычных ведаў аб лекавых і гаючых сродках, гігіенічных навыках, папярэджанні і лячэнні хвароб і зберажэнні здароўя наогул.

З узнікненнем першых пасяленняў і гарадоў на тэрыторыі Беларусі з’явілася неабходнасць у аказанні медыцынскай дапамогі і выкарыстанні разнастайных лекавых сродкаў. Так, у сярэдневяковай Беларусі пачалі з’яўляцца асаблівыя знахары, ведуны, вешчуны, чараўнікі, якія разам з прадказаннем лёсу і варажбой займаліся яшчэ і лячэннем. Нашы продкі звярталіся па дапамогу і да гандляроў лекамі. Найбольш вядомымі лекаведамі на нашых землях былі Іларыён Кіеўскі, Нестар Тураўскі, Кірыла Тураўскі, Даніла Заточнік і іншыя. Яны рыхтавалі лекі ў выглядзе прысыпак і парашкоў, настояў і адвараў, мазяў і камянёў для прыпякання і сталі ў пэўнай ступені першапачынальнікамі фармацыі на беларускіх землях.

Першыя звесткі пра аптэкі на тэрыторыі Беларусі адносяцца да XVI стагоддзя, а дзейнасць першых аптэкараў узгадваецца ў перапісной кнізе Пінска за 1561-1563 гады. Аб узроўні тагачаснай аптэчнай справы сведчыць цэлы шэраг дакументаў, аднак у іх назіраюцца разыходжанні ў поглядах на сродкі і прыёмы лячэння і нават супярэчаць адзін аднаму.

Пачынаючы з XIX стагоддзя, народная медыцына вывучаецца беларускімі этнографамі. Цікавасць да яе не губляецца і ў нашы дні: праводзяцца даследаванні дзейнасці беларускіх народных лекараў, ацэньваецца ўплыў ўмоў жыцця на ўяўленні людзей адносна сутнасці многіх хвароб і метадаў іх лячэння ў розныя эпохі, вывучаюцца матэрыяльныя асновы народнай медыцыны на падставе старажытнай спадчыны.

Сярод траўнікаў сучаснай Беларусі найбольш знакамітым з’яўляецца С.І.Вількоцкі, які ў 1946 годзе даў другое жыццё Рубяжэвіцкай аптэцы, пабудаванай у Стаўбцоўскім раёне ў 1875 годзе. Ён усё сваё жыццё збіраў рэцэпты раслінных лекаў і веды па фітатэрапіі, чым унёс непамерны ўклад у развіццё аптэчнай справы спачатку ў СССР, а затым і ў Беларусі.

Падагульняючы сказанае, можна зрабіць выснову, што вытокі фарміравання леказнаўства на Беларусі, як і станаўленне медыцынскай навукі ў цэлым, суадносяцца са шматвяковымі народнымі традыцыямі ў галіне лячэння і заснаваны на здабытых папярэднімі пакаленнямі ведах у медыцынскай сферы. З даўніх часоў пры лячэнні хвароб і раненняў жыхары нашага краю карысталіся зёлкамі, пладамі, насеннем раслін, а таксама сродкамі жывёльнага паходжання.